Падтрымай "Вясну" на PATREON

Затрыманні не спыняюцца ні на дзень: хроніка пераследу 3 жніўня дапоўнена

03.08.2022 **Тэгі**: крымінальны пераслед, пераслед, затрыманні

У Беларусі па-ранейшаму працягваюцца затрыманні, ператрусы, катаванні ў ізалятарах, аказваецца ціск на палітвязняў, незалежныя медыяпрадукты прызнаюць экстрэмісцкімі матэрыяламі. Адбываюцца рэпрэсіі ў дачыненні да грамадзян, якія актыўна выказваюць сваю пазіцыю ў адносінах да вайны, распачатай узброенымі сіламі Расіі. Праваабарончы цэнтр "Вясна" 3 жніўня збірае апошнія факты палітычнага пераследу грамадзян Беларусі.

> ***Калі вас ці вашых блізкіх затрымалі, паведамляйце нам:***
>
> - ***праз тэлеграм-бот @viasna_bot;***
> - ***на гарачую лінію ў тэлеграм @ViasnaSOS, @SOSViasna***

Жыхара Слоніма затрымліваў ГУБАЗ і АМАП

У Слоніме 2 жніўня супрацоўнікі ГУБАЗ і байцы АМАП затрымалі **Дзяніса Ваўчка** па падазрэнні ў здзяйсненні адміністрацыйнага правапарушэння.



Аднак адзін з праўладных каналаў паспяшаўся напісаць болей: *“ГУБАЗ і байцы АМАП затрымалі неверагоднага, які ў 2020 годзе адправіўся рабіць рэвалюцыю ў Мінску. Ну а далей стандартны набор: распаўсюджванне экстрэмісцкіх матэрыялаў і абраза прадстаўніка ўлады”.*

Завершана расследванне па справе Ігара Ледніка

Чакаецца, што судовае разбіральніцтва распачнецца ў пачатку верасня. Нагадаем, што Ігар Леднік абвінавачваецца па арт. 367 КК РБ "Паклёп у дачыненні да прэзідэнта Рэспублікі Беларусь" за публікацыю ў партыйным часопісе "Пазіцыя". Яго Фэйсбук-старонка прызнана экстрэмісцкай.



З красавіка 2022 г. Ігар знаходзіцца ў турме. Перад гэтым ён двойчы адбыў адміністрацыйныя пакаранні ў выглядзе адміністрацыйнага арышту.

Ігар Леднік мае інваліднасць праз праблемы з сэрцам. Вядома, што ў камеры ён згубіў прытомнасць пасля чаго ў экстранным парадку яму была зроблена аперацыя на страўнікава-кішачным тракце. На дадзены момант стан яго здароўя нездавальняючы, працягвае скардзіцца на болі ў страўніку.

На фэсце Viva Braslav хлопца затрымалі "за дэманстрацыю" татуіроўкі з "Пагоняй"

На нядаўнім музычным фестывалі Viva Braslav было затрыманне наведвальніка "за дэманстрацыю" татуіроўкі з "Пагоняй" і "сімвала анархізму". Сілавікі заявілі пра "экстрэмісцкую сімволіку". Затрыманага яны назвалі анархістам. Па іх версіі, на фестывалі ён быў без майкі, таму міліцыянеры і заўважылі татуіроўкі.



Як піша @mediazona_by, затрыманы **Міхаіл Тарлоўскі.** Ці быў ён ужо асуджаны, інфармацыі пакуль няма.

У Магілёве затрыманы работнік "Магілёўліфтмаша" Сяргей Балашэнка

Супрацоўнікі 11-га ўпраўлення ГУБАЗіК МУС РБ палічылі, што Балашэнка распаўсюджваў матэрыялы, прызнаныя "экстрэмісцкімі". Пра затрыманне паведамляе MAYDAY.TEAM.

У палітвязня Паўла Вінаградава – падазрэнне на сухоты

Раней у яго выявілася пляма ў лёгкіх, але курс антыбіётыкаў не дапамог.

Сёння стала вядома, што 28 ліпеня Паўла перавялі ў аршанскую Папраўчую калонію № 12, вядомую тым, што там утрымліваюцца і лечацца асуджаныя, хворыя на актыўную форму сухотаў.

Таксама ёсць інфармацыя, што Паўла Вінаградава пазбавілі працяглага спаткання за сон удзень – яго прызналі «злосным парушальнікам рэжыму».

Затрымалі дырэктарку турыстычнага агенцтва «Віяполь» Галіну Патаеву

У праўладных тэлеграм-каналах з'явілася інфармацыя пра затрыманне кіраўніцы турыстычнага агенцтва «Віяполь» і выкладчыцы кафедры эканамічнай геаграфіі БДУ Галіны Патаевай, паведамляе "Наша Ніва".



Жанчыне інкрымінуюць удзел у пратэстах 2020 года. Яна, па словах сілавікоў, «актыўна падтрымлівала ўдзельнікаў масавых беспарадкаў» і «займалася распаўсюджваннем экстрэмісцкіх матэрыялаў». Таксама ў яе на старонках у сацыяльных сетках нібыта былі лагатыпы незалежных СМІ і нацыянальная сімволіка.

«Зачыстка» ў Пінску — вядома пра як мінімум 5 затрыманых

"Вясна.Брэст" паведамляе пра затрыманні, якія ўчора адбыліся ў Пінску. Не менш за 5 чалавек, сярод якіх тыя каго раней ужо неаднаразова затрымлівалі: **Алесь Рамановіч і Дзяніс Сядых.**

У людзей зладзілі вобшукі. Аднаму, меркавана, пагражае крымінальны артыкул за «распальванне варожасці».

Два тыдні таму «зачысткі» праходзілі ў Іванаве, Драгічыне і Мазыры.

Магілёўскі суд прызнаў «экстрэмісцкімі» сацсеткі дарадцы прэзідэнта Украіны Аляксея Арастовіча

Такое рашэнне суд прыняў 27 ліпеня.

«Экстрэмісцкімі» прызналі youtube-канал Alexey Arestovych, старонку alexey.arestovich у інстаграме, фэйсбук-акаўнт «Алексей Арестович» і тэлеграм-каналы Arestovich/Official і Arestovich/Алексей Арестович.



57 крымінальных спраў па «справе Зельцэра» ўжо накіравалі ў пракуратуру

Пра гэта паведамляе прэс-служба Следчага камітэту.

Па версіі ведамства, абвінавачаныя «выкарыстоўваючы ў якасці інфанагоды навіны аб гібелі супрацоўніка КДБ, размясцілі паведамленні, якія заклікаюць да варожасці ў адносінах да супрацоўнікаў праваахоўных органаў».

Інфармацыя дапаўняецца

Твитнуть





СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

